# СЛЕД ВАЙНЫ Ў МАЁЙ СЯМ’І

**Н.У. МАГЕР, А.А. МАГЕР**
*Пінск, ліцэй ПалесДУ*

Як вымераць тое, колькі людзі аддалі за Перамогу? Ці можна ацаніць, чыё жыццё, смерць, чый подзвіг паскорылі яе больш за іншых? Таго васямнаццацігадовага салдата тэрміновай службы, што загінуў 22 чэрвеня 1941 года, ці таго, што прайшоўшы праз усю вайну, вярнуўся пераможцам? Няма адказу… Бо няма цаны гэтай спадчыне, подпісы пад якой зроблены крывёю, бо кожнае жыццё для блізкіх людзей - неацэннае.

Адбудаваліся гарады і вёскі пасля разбуральнай вайны… Некалькі разоў на год мы ходзім пакланіцца памяці загінуўшых за наша мірнае неба да брацкіх магіл… Усё менш побач тых, хто можа расказаць пра вайну. Але сваімі аповедамі яны прымушаюць нас помніць пра мінулае, ведаць імёны герояў і ахвяр мінулай вайны, каб жахі Другой сусветнай ніколі больш не паўтарыліся. І пакуль жывыя тыя, хто можа расказаць хоць нешта, мы абавязаны ў імя будучых пакаленняў з вуснаў пакалення старэйшага пачуць праўду пра вайну.

Репозиторий ПолесГУ

У нашай сям'і пра вайну расказвае бабуля, і со слоў родзічаў, прадзед па бацькавай лініі. Бабуля была зусім маленькай. Але ўражанні настолькі моцныя, што пра многае яна гаворыць: "…вось як цяпер бачу". Ці такія ўспаміны з дзяцінства павінны быць?

Мы апыталі каля сотні аднагодкаў, пятнаццаці-, шаснаццацігадовых юнакоў і дзяўчын, пра іх першыя дзіцячыя ўспаміны. Вось некаторыя з іх.

Віка (15 гадоў): "Мне было гады тры, помню: я выбегла ў двор, дзеці каталіся на арэлях, я падышла заблізка - арэлі крыху рассеклі лоб, было страшна, балюча. Прыбегла мама, супакоіла. Зашылі лоб у бальніцы".

Паша (15 гадоў): "Найранейшыя ўспаміны - гадоў з чатырох - пяці. Як хадзіў у садок, ранішнікі, святы…"

Эльміра (15 гадоў): "Мне было гады тры, калі тата прыехаў з доўгай далёкай камандзіроўкі і прывёз велізарны пакет цукерак…"

Улад (16 гадоў): "Самы яркі першы ўспамін… Калі ў тры гады ўставіў шпільку ў разетку. Нічога не адбылося (смяецца), але мама так расхвалявалася, што ў мяне адпала жаданне паўтараць эксперымент. Хоць я яшчэ доўга не мог зразумець, чаму гэтага няможна рабіць..."

А вось успаміны маёй бабулі, Ярошык Ганны Іванаўны (у дзявоцтве Ляўшун), 25.09.1939 г. н., якая дзівам двойчы пазбегла лёсу жыхароў Хатыні. Ганна (79 гадоў): " Помню, як мама з бацькам хутка і моўчкі апранулі нас, чацвярых дзяцей (старэйшую Марыю сагналі ў Германію), схапілі, што паспелі, пакідалі нас на воз і кудысьці павезлі.

Было холадна, імжыў дождж, мы ўтрох, старэйшыя дзеці, ляжалі на возе, які вез нас з падпаленай немцамі роднай вёскі. Мне было ўжо гады два. Усе, хто не паспеў з'ехаць тады з Вулькі Гарадзішчанскай, спалены ці расстраляны… (Вёска Вулька Пінскага раёна Брэсцкай вобласці, што налічвала да вайны 202 дамы з 731 жыхаром, спалена (174 хаты і 275 вяскоўцаў) у сакавіку 1943 года падчас аперацыі "Горнунг" (заўв. аўтара)

Далей помню, як адчынілі браму і мы заехалі ў двор дома. Гаспадары ўпусцілі нас на пастой, хоць самім асабліва і

есці не было што, і спаць няма дзе. Але людзі ў той час былі іншыя: дапамагалі адзін аднаму, дзяліліся апошнім…

Гэта было ў вёсцы Новы Двор, дзе мы як выгнанцы пражылі нейкі час. Пэўна, быў ліпень ці жнівень: жыта вялікае стаяла. Мамы не было дома. Я спала на парозе. У вёску ўвайшлі немцы. Суседка схапіла мяне за руку, помню, як тузанула (у мяне доўга рука балела) і пацягнула ў гэта жыта. Мы доўга ў ім хаваліся з усімі суседзямі: баяліся выходзіць да немцаў, якія спыніліся ў вёсцы.

З часам давялося выйсці…

І жылі неяк. Бо вайна – гэта таксама жыццё, толькі іншае…

Немцы забіралі ўсю жыўнасць, у каго што было. У нас была карова і цялушка. Мама хацела зарэзаць, каб было што з’есці (бо чацвёра дзяцей!). А тата не даваў, таму што “ето Гандзіно” (мой, значыць, пасаг). Прыйшлі немцы і ўсё забралі. Нічога не засталося. Пад печкай хавалася курыца, і тую застрэлілі і забралі.

Аднойчы ўвесну (год, пэўна, 1943), помню, мама паліла ў печы. Прыйшоў немец, сказаў, каб хутка збірала дзяцей і выходзіла да царквы. Мама замарудзіла, тады ён стукнуў яе прыкладам па галаве. Яна пахапала нас і выбегла на вуліцу (плача). Нас зганялі да царквы, каб спаліць. Калі мы прыйшлі, у царкве было поўна людзей (вясковая царква - маленькая). Тых, хто не змясціўся (як наша сям'я) паставілі пад царквой. Я стаяла поруч з татам, за руку яго трымала, мама з маленькай Маняй на руках,  старэйшыя дзеці побач. Помню, калі немцы пастроіліся насупраць нас з аўтаматамі, тата закрыў мне вочы рукой (плача).

Другі раз нас Бог пашкадаваў. Прыскакалі нейкія конныя людзі, нешта гучна сказалі немцам (потым казалі: мадзьяры), і нас усіх распусцілі! Людзі рынуліся ўрассыпную хто куды! Мы таксама не сталі вяртацца дахаты: баяліся. Палілі вогнішча ў лесе, так грэліся. А есці не было што. Калі зганялі да царквы, ніхто з сабой нічога не браў. Ведалі, для чаго гоняць… Толькі адзін мужчына ўзяў бохан хлеба. Хлеб патроху давалі толькі дзецям, дарослыя не елі...

Репозиторий ПолесГУ

Памятаю, што нам часта даводзілася хавацца ў лесе. Есці не было чаго. Збіралі грыбы (кошкі), вялілі на вогнішчы і карміліі нас, дзяцей.

Вярнуліся на Вульку пасля вайны (там была наша зямля) - а дом спалены. Зрабілі будку: збітыя жэрдкі накрылі чаротам (абы дождж не ліў на галаву), прыкладна тры на два метры. На зямлі спалі.

Дзяцей потым забралі да сябе суседзі, Дамініка і Дзяніс (сваіх дзяцей у іх не было). Бацька захварэў яшчэ да вайны, яго ніхто не хацеў да сябе пускаць жыць. Ён зрабіў сабе на агародзе будку (толькі на карачках можна было ўлезці), а мы, дзеці, насілі яму туды, што Дамініка ў збанок нальe. Аднойчы, памятаю (іней быццам нават выпаў), прынеслі, а есці ўжо няма каму (плача) - памёр. Калі прыйшла мама з агарода, нас забралі да Каваліхі, пакуль у той хаце, дзе жылі, рабілі труну для бацькі. Мы так і не змаглі развітацца з ім, выпаў снег, а апрануць і абуць не было чаго ...



**Бабулі 12 гадоў, сукенка і боты куплены на самастойна зробленыя грошы**

Потым забрала да сябе нас усіх разам хросная мая, Оля. У яе муж загінуў на вайне - дзяржава дапамагала, жыць было

лягчэй. Хоць пра якое "лягчэй" можна казаць?У 1951 годзе, калі мне яшчэ не было дванаццаці гадоў, давялося пайсці працаваць, як і старэйшай Соні, 1932 года нараджэння, у нянькі, да Казя і Серафіны, за тое, каб пакармілі, таму што маме было цяжка ўсіх карміць. Тады і скончылася маё дзяцінства, пачалося сталае жыццё…

У 1956 годзе, пасля навучання ў Мінску пайшла рабочай на Вучэбна-вытворчае прадпрыемства Таварыства сляпых горада Пінска, дзе прапрацавала ўсё жыццё. Шмат хто казаў, што магла зрабіць кар'еру: разумная, кемлівая. Але вучыцца не было калі. Пакуль жыла з мамай - не было што апрануць і абуць, каб у школу пайсці, і грошай на сшытак і чарніла. Мама казала, калі я прасіла 20 капеек на сшытак: "Двaццaць копiёк ды двaццaць копiёк - так я куплю булку хліба, ды ўсе наімося. А тваю цэтрадзь нэ будэм йісты ". Два гады прасядзела ў адным класе. Усяго адукацыі ў мяне - тры класы. Але я пражыла шчаслівае жыццё, я не скарджуся, таму што гадавала дзяцей пад мірным небам ".

Калі я бываю ў бабулі, яна часта расказвае мне пра сваё апаленае вайной, украдзенае дзяцінства, пра галоднае, цяжкае, але мірнае юнацтва, пра клопатнае, але шчаслівае сталае жыццё. І ўсё часцей у апошні час яна баіцца, што ёй яшчэ раз давядзецца перажыць жахі вайны не толькі ў сне.

На жаль, усё менш тых, хто можа расказаць пра вайну. Шкада, што тыя, хто мог бы пра яе расказаць нам і нашым дзецям, ужо не з намі…

Пражыўшы доўгае жыццё, поўнае клопатаў і турбот, дваццаць гадоў таму пайшоў ад нас Андрэй Антонавіч Казубоўскі. Кожнае лета гасцявалі ў дзядулі і бабулі ўнукі. Шмат аб чым гутарылі. Але дзяліўся дзядуля ўспамінамі пра цяжкае, але мірнае жыццё. Не хацеў, пэўна, успамінаць тую жудасць, з якой сустрэўся на фронце.

Вайна для сям'і Казубоўскіх, як і для большасці беларусаў, пачалася ў 1941 годзе. Амаль два гады акупацыі… А ў маі 1943 Андрэй Антонавіч разам з сям'ёй (цяжарная жонка Ксеня, дочкі Марыя і Вольга, сын Аляксей) ва ўзросце 35 гадоў быў вывезены на работы ў Германію (тое, што памятае Аляксей, старэйшы сын,  маёнтак Бухгольц, прыкладна 40 км

ад Франкфурта-на Одэры, зараз гэта тэрыторыя Польшчы). Без малога два гады працавалі на немцаў. Пасля вызвалення у лютым 1945 года сям'ю адправілі дадому, а дзядулю разам з іншымі мужчынамі ваенна-палявы ваенкамат у Франкфурце-на-Одэры прызваў у армію, у пяхоту.



**Прадзед у вайсковай форме**

Вялікае шчасце для сям'і – вярнуўся жывы. Нават не быў паранены. Бо браты-аднавяскоўцы Кабрынцы, што ваявалі разам з дзедам у адным падраздзяленні, абодва загінулі ў жорсткім баі. У гэтым жа баі "дзядулева" куля прабіла толькі гімнасцёрку, апаліўшы плячо, але пакінуўшы жыццё.

Ваяваў на 1 Беларускім фронце, вызваляў Германію, сустрэў Перамогу ў Пацдаме, пасля наведаў Берлін. Узнагароджаны ордэнам "За адвагу". Дадому вярнуўся толькі ў кастрычніку 1945 года.

Гэта ўсе звесткі, што ўдалося сабраць зараз. Ці сціпласць дзядулі не дазваляла расказваць пра вайну, ці вельмі страшэнным было тое, што ён перажыў?

Мы не ведаем, як складзецца жыццё. Але ўпэўнены, што гісторыю пра вайну, якую даведаліся не з тэлевізара, не з фільмаў, а з тых дакументаў і ўспамінаў блізкіх людзей, пе-

рададзім і сваім дзецям. І яшчэ мы вельмі хочам, і абавязкова ўсё для гэтага будзем рабіць, каб гэта страшная вайна не была забытая.

Репозиторий ПолесГУ